

# Чалавек ад зямлі

## Творчы свет Міхаіла Казінца такі ж неабсяжны, як і яго любоў да Радзімы

**Жылі-былі два браты, розныя, як вярба і елка. Старэйшы, Мікалай, – высокі, хударлявы і, паводле бабы Волі, горды. Міхаіл жа – ніжэйшы ростам, крэпкі, плячысты – такі харошы, што заставаўся для вяскоўцаў «нашым Мішкам», нягледзячы на рэгаліі і іншую, на іх погляд, мішуру. Ніхто асабліва не дзівіўся, што звычайны хлопец з іх вёскі вырас да народнага артыста, ардэнаносца, прафесара, рэктара Акадэміі музыкі, мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора славутага на ўвесь свет Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя Жыновіча.**

З 91-гадовай Вольгай Мікалаеўнай Машынскай і 77-гадовай Вольгай Васільеўнай Круцько мы пазнаёміліся ў Цынцавічах (па-мясцоваму Цінцавічы), роднай вёсцы Міхаіла Казінца. Дзесяць кіламетраў ад Вілейкі па дарозе на Нарач, потым улева па грунтоўцы міма вёскі Жаўткі, дзе нарадзілася яго маці Людміла Іванаўна Валынец, – і вось яно, паселішча. Трыццаць тры хаты ўздоўж вуліцы Цэнтральнай.

Мяркуючы па нумарацыі, раней іх было болей, дый тыя, што засталіся, пераважна куплены пад лецішчы. Як ні дзіўна, дырыжор з гэтага цешыўся: «Жывуць мае Цынцавічы! Вёска не вымірае, бо прыязджае многа людзей жыць».

З-за разліву звычайна ціхамірнай рэчкі Спорні падворкі на няцотным баку вуліцы ператварыліся ў суцэльнае балота. Калі б не пазычаныя Вольгай Круцько гумовікі, не дабраліся б мы з фотакарэспандэнтам да Вольгі Машынскай. Бо хатка яе ў глыбіні двара, дзе вады было на далонь вышэй за шчыкалатку, а пачынаўся патоп ад самай брамкі.

Вольга Мікалаеўна ведае братоў Казінцоў ад іх нараджэння. Памятае і маці, і бацьку, і дзеда з бабай:



Маленькага Мішу ледзь відаць за вялізным гармонікам. Цынцавічы, канец 1940-х гадоў



Міхаіл Казінец з бацькамі ў Вілейцы. Пачатак 1970-х гадоў

– Крыстынай, здаецца, бабу звалі… Не памятаю, вельмі рана памерла. Пахавана тут, у Цінцавічах, а яны ўсе ў Вялейцы (менавіта так, праз «я» вымаўляе жанчына, а раку называе Вялеяй).

Зрэшты, пра справы сямейныя баба Вольга расказвае мала і неахвотна. Больш пра тое, які Міша быў «харошы ды вясёлы» і як у апошнія гады прыязджаў у вёску.

*«Сядае паміж мною і суседкай, абдымаіць, цалуіць, смяецца і гаворыць з намі».*

Сам ён пра тыя свае візіты згадваў у інтэрв'ю даволі скупа: «Засталіся яшчэ сяброўкі майго ўзросту. Я пазнаць не магу іх».

Але пазнаваў, яшчэ як пазнаваў!

– Некалі хаджу я па двары, – згадвае мая суразмоўца, – і свайму хазяіну кажу: «Вой, Грыша, голас Мішы Казінцава!» У вёсцы іх Казінцавымі называлі. Выходжу на вуліцу – праўда, Міша! Стаіць машына, куча людзей. Тады яшчэ асфальту не было, вуліца брукаваная. На бруку стол, на стале закускі, гарэлка, ён з усімі цалуіцца, усіх прыглашаіць, угашчаіць. Убачыў мяне: «Вой, Вольга! І яшчэ якая крутая!» Сядае паміж мною і суседкай, абдымаіць, цалуіць, смяецца і гаворыць з намі.

– Ці часта прыязджаў?

– Не так што часта, можа раз у паўтары гады. Тут ён сустрачаўся з друзьямі, з каторымі рос. Прыязджаў усягда з грамадой, з маладзёжжу. Гаварылі, дочка аднойчы з ім была. У яго доме ўжо жылі дачнікі, дэк ён туды зайшоў, хазяйка стол вынесла і скацерць паслала…

Лектар-музыказнаўца аркестра Жыновіча Вольга Брылон мне расказвала, што мэблю з бацькоўскай хаты ён тады пазнаў і моцна плакаў.

– Залатой быў чалавек, а Мікалай зусім другі, горды быў. Гэта не толькі я кажу, усе ў нас гэтак гаварылі, – падсумоўвае баба Воля.

91-гадовая жыхарка Цынцавіч Вольга Машынская памятае бацькоў і дзеда Міхаіла Казінца



Хата ў Цынцавічах, дзе нарадзіліся браты, стаіць дагэтуль.

– Але, дзеткі, яна выглядала зусім іначай! – папярэджвае баба Вольга, каб мы не пужаліся белых шклопакетаў, што сказілі яе знешні выгляд і дух.

Дзякуй Богу, старыя часаныя бярвёны засталіся, не схаваліся пад сайдынгам. І нефарбаваная шалёўка на фасадзе дакладна такая ж, як на сямейным фота канца 1940-х гадоў, дзе з цыгаркай, нага за нагу сядзіць бацька Антон, а за яго плячыма – суровы і строгі дзед Янук. З-за велізарнага гармоніка ледзьледзь відаць малы Міша, побач маці Людміла з гладкай прычоскай, без хусткі, без паказной бабскай пакоры. І на завяршэнні кадра – постаць Колі, які зухавата сядзіць на ровары. Пэўна, маёмасць яшчэ з царскіх часоў, галоўны доказ сямейнай заможнасці і руплівасці.

Адзін Міша на гэтым фотаздымку ўсміхаецца, дарослыя ж пазіраюць сурова і недаверліва. Іх вачыма глядзіць Заходняя Беларусь, што не ачуняла яшчэ ад акупацый і войнаў, але гордая і годная.

У вёсцы ўпікаюць, што Антон не ваяваў, а сядзеў дома.

### *«Гармонік першапачаткова куплялі не яму, а старэйшаму брату».*

– З бацькам маім тады сябраваў, – смяецца баба Воля. – Нават ездзіў у Вілейку па ветэрынара, калі ў нас карова ледзь не здохла.

Паводле архіўных дакументаў, пасля вызвалення Вілейшчыны Антон Казінец пайшоў ваяваць, пад Кёнігсбергам быў паранены. Кавалер ордэна Вялікай Айчыннай вайны першай ступені, інвалід другой групы.

Да 1952 года сям'я жыла ў Цынцавічах, дзеці хадзілі ў мясцовую пачатковую школу.

Захавалася ўнікальная дакументальная стужка, дзе маці Людміла Іванаўна ўспамінае, як загартоўваўся характар будучага дырыжора: «Мама, кіно прывязуць! – Якое кіно? Хіба што карцінкі ў школе. – Не, сапраўднае кіно. Дай 27 грошай. – Добра! – І тады ўжо ён жнець, толькі каплі з лобу лятуць. З сярпом на плячо разам са мной па ўзагонах. Нават след на руцэ ад жніва захаваўся».



У класе, дзе некалі вучыўся іграць на баяне Міхаіл Казінец, цяпер выкладае гітару Уладзімір Лапцік

Але ўсё ж хлопец больш завіхаўся з бацькам – «з канём, па дровы, араць, баранаваць. Усе дзеткі ў вёсцы ў полі рабілі. Ніякага спорту не было. Калі ў полі робіш, тады і дужыя, і здаровыя».

Міхаіл Казінец усё жыццё ганарыўся сваімі сялянскімі ўніверсітэтамі.

Найбольш цешыўся ўменнем касіць. Расказваў, як яшчэ за савецкім часам з аркестрам давалі канцэрт у нейкай вёсцы: «Ліпень, спякота, а ў школьнай зале, якую нам прапанавалі, арктычная сцюжа. Можна б выступіць на пляцоўцы перад школай, але там трава ледзь не ў пояс. Кажу служыцелю: пакасіць бы! А ён касу мне ў рукі: касі! Малатком яе адбіў, зрабіў двайны пакос і два адзінарныя. Убралі з хлопцамі сена, канцэрт прайшоў на ўра, і тут служыцель выйшаў перад публікай дый кажа: „Хораша зайгралі, але як ён касіў, яго маць!“ Навучаў мяне касьбе дзед Янук. Стаяў я ў пакосах сумесна з бацькам, з другімі касцамі. На той час здавалася, лепей бы пагуляць. А зараз адчуваю, як выдатна, што ў маім жыцці гэта было».

Ці вучыў дзед Янук малога музычнаму рамяству? Ён жа быў славуты на ўсю ваколіцу скрыпач, без якога не абыходзілася ніводнае вяселле. Маці Людміла выдатна спявала старажытныя абрадавыя песні – траецкія, вясельныя, купальскія. Але гэта



Дырэктар Вілейскай школы мастацтваў Наталля Сліжова беражліва захоўвае пасведчанне аб прысваенні Казінцу звання ганаровага грамадзяніна Вілейкі



Мікалай Балынец настройвае школьнае піяніна, якое падарыў Міхаіл Казінец

справа жаночая. Захаваліся кадры: мама спявае, а сын зачаравана глядзіць на яе і прагна глынае кожную ноту старадаўняга жніўнага спеву.

– Гармонік першапачаткова куплялі не яму, а старэйшаму брату, – усміхаецца Юрый Казінец, сын дырыжора. – Але ў Мікалая не атрымалася, а Міша, хоць малы быў, адразу ўхапіў, падбіраў мелодыі на слых – «быў дэтэктарны прыёмнічак на вушы, гармонік у руках і, безумоўна, тое, што гучала ў асяроддзі».

Дзед Янук запрыкмеціў захапленне ўнука і, хоць не ведаў, што такое абсалютны слых, зрабіў усё, каб той усур'ёз вучыўся музыцы. Сям'я (праўда, без дзеда) пераехала ў Вілейку, дзе была музычная школа. Аднак для вучобы патрабаваўся не вясковы гармонік, а прафесійны баян.

– Дзед мех збожжа прадаў, каб яго купіць, – з захапленнем кажа Юрый Казінец. – Пасля вайны хлеб быў вялікай каштоўнасцю.

Унук аддзячыў дзеду не толькі дапамогай у полі, але і хуткімі поспехамі.

– Музычную школу ён адолеў за тры гады, – расказвае Наталля Сліжова, дырэктар Вілейскай школы мастацтваў імя Міхаіла Казінца. – З першага класа адразу перайшоў у трэці, з трэцяга – у выпускны пяты.

– Школа месцілася ў драўлянай хаціне, якой цяпер ужо няма, – удакладняе аднакласнік Казінца Мікалай Балынец.

Тады яна лічылася вілейскім філіялам Маладзечанскай музычнай школы. Пазней атрымала самастойнасць, а год таму ёй прысвоілі імя былога вучня Міхаіла Казінца.

## *«Выхопліваў у мяне скрыпку і шморгаў на ёй. Вылузваўся перад дзяўчатамі: „Выступае народны артыст СССР Ігар Бязродны!“»*

– Зразумела, мы гэтым вельмі ганарымся, – прызнаецца Наталля Сліжова.

Дырэктар упэўнена, што школа і яе таленавітыя вучні годныя памяці знакамітага земляка.

А Мікалай Балынец працягвае згадваць далёкія 1950-я:

– Ён быў перарастак, звычайная справа на той пасляваенны час. Вучыўся на баяне ў Івана Піліпавіча Касцючэнкі. Акампаніраваў дзяўчатам, якія спявалі, у тым ліку маёй сястры. Гарэзнічаў. Здаралася, выхопліваў у мяне скрыпку і шморгаў на ёй. Вылузваўся перад дзяўчатамі: «Выступае народны артыст СССР Ігар Бязродны!»

Балынцу 80, больш як палову стагоддзя выкладаў у Вілейскай музычнай школе скрыпку. Апошнім часам працуе настройшчыкам, лечыць і наладжвае школьныя фартэпіяна. Нам пашанцавала заспець яго за настройкай акурат таго піяніна, якое падарыў роднай школе Міхаіл Казінец.

– Звычайны інструмент барысаўскай фабрыкі, – тлумачыць Мікалай Уладзіміравіч. – А для нас гэта сапраўдны скарб. Прычым, заўважце, інструмент не стаіць недзе ў куце. Дзеці на ім іграюць, як і хацеў Міхаіл Антонавіч. Ён быў чалавек ад жыцця, ад зямлі, сапраўдны мужык, без фанабэрыі. З ім можна было пагутарыць і пажартаваць на любыя тэмы.

Дзіцячая школа мастацтваў у Вілейцы вялікая: два корпусы, чатыры філіялы ў аграгарадках Ілля, Нарач, Даўгінава і Любань, класы ў Шылавічах, Іжы і Людвінове. Ажно 650 вучняў, 490 з іх вучацца іграць на музычных інструментах. Астатнія займаюцца харэаграфіяй, народна-прыкладным і выяўленчым мастацтвам.

Наталля Сліжова правяла нас у другі корпус школы – цагляны будынак 1936 года. Менавіта тут, паводле яе перакanання, калісьці вучыўся Міхаіл Казінец. А цяпер дзеці засвойваюць ігру на розных аркестравых інструментах. Першы корпус, навейшы, цалкам аддалі юным піяністам.

У старым будынку імкнуцца ўсё захаваць так, як было пры Казінцу. Уражвае чысціня і своеасаблівая атмасфера савецкага часу. Зазірнулі і ў клас, дзе, як лічыць Наталля Аляксандраўна, калісьці займаўся Міша. Цяпер тут выкладае гітару выдатны педагог Уладзімір Лапцік. У суседняй зале рыхтуюць выставу, прысвечаную юбілейнай даце. Летась у школе пабывалі ўдзельнікі Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча, якім на працягу 47 гадоў кіраваў Міхаіл Казінец. Аднак не дзеці з настаўнікамі слухалі артыстаў, а наадварот, прафесіяналы захапляліся майстэрствам мясцовых выканаўцаў.

– Надта страшна было, – уздыхае 12-гадовы акардэаніст, гонар музычнай школы Зміцер Рудак. – Зайграў з Божай дапамогай. Толькі з Божай, сам не зайграў бы.

Наталля Сліжова – цымбалістка па прафесіі – таксама выступала. Як і юныя выхаванцы, хвалявалася.

– Набор у нас дастатковы па ўсіх спецыяльнасцях, – гаворыць дырэктар. – Любяць нашу школу.




**Загадчыца школьнага музея Эла Качан і дырэктар Вілейскай СШ № 1 Іна Крышкоўская ганарацца знакамітымі выпускнікамі**



**Дванаццацігадовы лаўрэат шматлікіх музычных конкурсаў Зміцер Рудак працягвае традыцыі маэстра Казінца**

Выпускнікі прыводзяць сваіх дзяцей, эстафета працягваецца.

Галоўнае, тут захаваўся дух – тое, што Міхаіл Казінец асабліва цаніў.

– У яго заўсёды была асацыяцыя: памяняўся дух ці захаваўся, – усміхаецца Наталля Аляксандраўна.

Гэта і пра вілейскую сярэднюю школу № 1, якую Казінец скончыў паралельна з музычнай.

– Ён ніколі не абмінаў нас па дарозе ў Цынцавічы ці на Нарач, прыязджаў на вечары сустрэчы выпускнікоў, – згадвае дырэктар адукацыйнай установы Іна Крышкоўская.

– Казаў, што тут жыве дух утульнасці і волі, – удакладняе педагог-арганізатар, кіраўнік школьнага музея Эла Качан.

Пры тым, што будынак, у якім Міхаіл Казінец вучыўся, даўно ўжо не належыць школе: яшчэ ў 1962 годзе яна пераехала ў новае памяшканне.

Нам паказалі аўтограф Казінца ў памятнай кнізе: «Прайшлі гады, а ў сэрцы і памяці мае настаўнікі, сябры, час, які рабіў нас людзьмі». Напрыканцы сціплы подпіс: «Выпускнікі 1956 года».

Захавалася ўся яго школьная дакументацыя. Настаўніцы не хаваюць таго факта, што выдатны артыст не надта сябраваў з фізікай ды матэматыкай. Затое быў фантастычна таварыскі, шчыры і прыязны.

– У нас склаліся настолькі цёплыя стасункі! – ідавочна хвалюецца Іна Крышкоўская. – 18 мая, у яго дзень нараджэння і, дарэчы, мой, мы заўсёды тэлефанаваліся, віншавалі адно аднаго.

Дзівосна ці сімвалічна, але большасць вілейчан, з кім размаўляла пра Казінца, нарадзіліся ці не ў адзін з ім дзень.

– У яго былі сяброўкі-аднакласніцы. Быў найлепшы сябра Валодзя Ганчарык – таксама баяніст, пайшоў з жыцця два гады таму. У юнацтве яны разам ігралі на танцах, на вяселлях не для таго, каб зарабляць. Гэта стан душы. У беларускай мове ёсць вельмі прыгожае слова «апантаны». Ён любіў, каб пад яго музыку людзі весяліліся і танцавалі, – усміхаецца мая суразмоўца.

У школьным музеі захоўваюць успаміны народнага артыста, запісаныя старанным настаўніцкім почыркам: «У Вілейцы Дом культуры ніколі не пуставаў. Працавалі шматлікія гурткі, у бібліятэцы пастаянна таўкліся людзі. Уражанне, быццам народ спешна рынуўся рэалізоўваць сябе ў розных кірунках творчасці».

*«Ён быў чалавек ад жыцця, ад зямлі. Сапраўдны мужык, без фанабэрыі».*

Ёсць у гэтых успамінах і пра Віцебскае музычнае вучылішча, дзе Казінец вучыўся з 1956 па 1960 год. Спярша, паводле слоў сына, ледзь не пахаваў сябе ў прафесійна-тэхнічным вучылішчы недзе ў Калінінградзе, але своечасова перадумаў і рушыў у Мінск «паступаць на музыку». У сталічнае музвучылішча яго не ўзялі, і тады ён зноў змяніў курс: «Я прыехаў у Віцебск позна ўвечары, начаваў проста ў вучылішчы, а раніцай прыйшлі педагогі, праслухалі, залічылі і потым доўга спрачаліся, хто возьме мяне да сябе ў клас».

З гэтага моманту для Міхаіла Казінца пачалося новае жыццё. Ён іграў у аркестры, спяваў у хоры. І першае судакрананне да вечнай і прыгожай музычнай класікі. У запісах ён згадвае невядомага мне піяніста Вячаслава Кудраўцава: «Дзякуючы яму я ўспрыняў усю веліч раяля як музычнага інструмента».

Ці марыў ён тады акампаніраваць найлепшым піяністам Беларусі? Што на свой 80-гадовы юбілей у галоўнай філарманічнай зале краіны прадырыжы-

руе «Імяніннай уверцюрай» Бетховена, скрыпічным канцэртам Брамса і сімфоніяй Чайкоўскага «Манфрэд»? Напэўна, ужо разумеў, што баян для яго толькі пропуск у бязмежна шырокі свет музыкі.

І вось Беларуская кансерваторыя, куды ў 1960 годзе ён разам з сябрамі прыехаў паступаць. Леанід Іваноў – яго аднакурснік у Віцебску і ў Мінску, паплечнік, кіраўнік легендарнага аркестра народных інструментаў. Казінец шмат зрабіў для таго, каб Іваноў узначаліў Магілёўскае музычнае вучылішча, а потым і Магілёўскі філіял Беларускай акадэміі музыкі, створаны Казінцом падчас яго дваццацігадовага рэктарства. Ён паклапаціўся, каб студэнцкі аркестр пад кіраўніцтвам Іванова стаў прафесійным калектывам, а сам Леанід Леанідавіч – прафесарам, народным артыстам Беларусі.

Яны сталі роўныя па рэгаліях, і Казінец раіўся з ім па ўсіх пытаннях. Іваноў пайшоў з жыцця раней.

– Яны вельмі шмат абмяркоўвалі пры мне. Іваноў быў для яго і прыкладам, і сябрам, і таварышам, і сутворцам, – сцвярджае дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя Жыновіча Барыс Ліўшыц.

На першых курсах кансерваторыі абодва яшчэ бачылі сябе баяністамі. У ліпені 1963 года Міхаіл Казінец разам са студэнткай-спявачкай Валянцінай Паповай адзіныя ад Беларускай кансерваторыі ўдзельнічалі ў канцэрце ў Маскве на сцэне Тэатра Савецкай арміі ды ў гастрольным туры за Урал па сакрэтных вайсковых часцях.

Тэлерэжысёр Уладзімір Арлоў сведчыў, што Міша і Валя нават у плацкартным вагоне цягніка ўвесь час рэпеціравалі: «Міша расцягваў мяхі з раніцы да позняга вечара. Валя з ім спявала. Пасажыры падсаджваліся да іхняга купэ, прасілі выканаць песні па заяўках, самі падпявалі».

Аднак галоўнай яго мэтай і захапленнем было дырыжыраванне. Пра гэта мне расказвала мама – піяністка Людміла Андрэева, якая студэнткай працавала канцэртмайстрам у дырыжорскім класе Іосіфа Абраміса.

Другое захапленне – аранжыроўка, якую выкладаў Георгій Жыхараў. Ён стаў адным з любімых настаўнікаў Казінца. Навука прыдалася спачатку ў самадзейных калектывах, а потым у аркестры Жыновіча.

«1968 год, я ўжо скончыў першы раз кансерваторыю, працую выкладчыкам у музычным вучылішчы, асістэнтам па дырыжыраванню ў кансерваторыі, – успамінаў у інтэрв'ю Міхаіл Казінец. – Па маёй вялікай просьбе Іосіф Іосіфавіч даў мне падырыжыраваць



**Міхаіл Казінец дырыжыруе аркестрам імя Жыновіча на плошчы Свабоды ў Мінску. 2006 год**

сваім аркестрам. У мяне было тры дні працы з калектывам, і я адчуў, што феерверк не атрымаўся. Адна справа, калі сустракаешся са студэнтамі ці самадзейнымі аркестрамі, іншая справа – з прафесіяналамі. Я вырашыў, што трэба ісці іншай дарогай».

Літаральна праз месяц Міхаіл Казінец паступае ў кансерваторыю, цяпер ужо на оперна-сімфанічнае дырыжыраванне. Яму трыццаць, у яго жонка і дачка, сям'ю трэба ўтрымліваць (і ён гэта робіць!), але выбірае няпросты шлях, каб вучыцца далей.

– Калі прыйшоў сюды працаваць, здзівіўся: чаму ў кабінеце галоўнага дырыжора проста над галавой вісіць партрэт заслужанага артыста БССР Віталя Катаева, – расказвае Барыс Ліўшыц. – «Як, гэта мой настаўнік!»



Сустрэча з прыхільнікамі. Сярэдзіна 2010-х гадоў

– Міхаіл Антонавіч спачатку хацеў працягваць вучобу ў Абраміса, але пасля сустрэчы з Катаевым сказаў: «Толькі Віталь Вітальевіч і ніхто іншы!» – пацвярджае дырыжор аркестра імя Жыновіча, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі, дацэнт Акадэміі музыкі Аляксандр Высоцкі.

***«У беларускай мове ёсць вельмі прыгожае слова „апантаны". Ён любіў, каб пад яго музыку людзі весяліліся і танцавалі».***

Катаеў – масквіч, франтавік, вучань народнага артыста СССР Кірыла Кандрашына – у 1962 годзе стаў кіраўніком Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР. З гэтага моманту ў Беларускай філармоніі пачалося новае жыццё. Загучалі творы Шастаковіча, «Званы» Рахманінава, араторыя Анегера «Жанна д'Арк на вогнішчы»… У 1966 годзе Віталь Вітальевіч стварыў і ўзначаліў кафедру оперна-сімфанічнага дырыжыравання, на якую паступіў Казінец.

Аднак акурат у 1968 годзе Катаева ў шэрагу іншых маскоўскіх прафесараў выгналі з кансерваторыі. Казінец, нягледзячы на цяжкасці, моцна трымаецца свайго выбару. Фактычна ён вучыцца ў Маскве. Сяброўскія стасункі настаўнік і вучань падтрымлівалі аж да смерці Віталя Вітальевіча ў сакавіку 1999 года.

Шмат гадоў прайшло, і аркестр Жыновіча атрымаў запрашэнне выступіць падчас Дзён культуры Мінска ў Астане.

– Міхаіл Антонавіч прапанаваў «Рэвізскую казку» славутага савецкага авангардыста Альфрэда Шнітке. У мяне вочы на лоб палезлі, але Казінец і слухаць не хацеў, – расказвае Барыс Ліўшыц. – І што вы думаеце? У Астане быў фурор! Я ніколі не бачыў Міхаіла Антонавіча на такім уздыме. У паўзах паміж раздзеламі ён паварочваўся да публікі і абвяшчаў назву наступнай часткі.

Акурат так, як рабіў Катаеў, прыязджаючы ў Мінск са шматлікімі творамі Шнітке, калі яны яшчэ не выконваліся нават у Маскве.

Ці заўважыў хтосьці гэта прынашэнне настаўніку? Сваю вучобу ў Катаева Казінец ніколі не рэкламаваў, не пыжыўся адукаванасцю, можа вышэйшай, чым у тых, хто кпіў з яго «вясковасці».

Заняткі з Катаевым прынеслі плён: на чацвёртым курсе Жыновіч бярэ яго другім дырыжорам, а далей доўгая-доўгая дарога ўгору, дзе Казінца чакала прызначэнне на пасаду галоўнага дырыжора, ордэн Дружбы народаў, Дзяржаўная прэмія і ганаровае званне народнага артыста БССР.

– Пакуль бацька не стаў рэктарам, ён месяцамі гастраліраваў, нават у Індыі, – успамінае Юрый Казінец. – Дома бываў два-тры месяцы ў годзе. Калі прыязджаў, у нас было свята.

Аднак пасля 1985 года, калі Міхаіл Антонавіч заняў рэктарскую пасаду, больш займаўся кансерваторыяй.

У 1992 годзе яму прыйшла ідэя ператварыць студэнцкі сімфанічны аркестр кансерваторыі ў паўнацэнны канцэртны калектыў. Так нарадзілася «Маладая Беларусь» – аркестр, з якім ён аб'ехаў паўсвету і выканаў ледзь не ўвесь класічны сімфанічны рэпертуар.

– Не было нават размовы пра тое, каб прапусціць рэпетыцыю аркестра, нават у суботу ў 8.40 раніцы, – усміхаецца тагачасная студэнтка, а цяпер канцэртмайстар першых скрыпак Прэзідэнцкага аркестра Марыя Пішчык. – Міхаіл Антонавіч падаваў нам прыклад не толькі як музыкант і творчая асоба, але і як чалавек надзвычай дысцыплінаваны, з высокімі жыццёвымі прынцыпамі.

Рэпеціравалі чатыры разы на тыдзень. Шмат гастралявалі. Арганізаваць фестывалі ў Еўропе Казінцу дапамагаў колішні аднакурснік, оперны барытон Аркадзь Валадось, які з канца 1960-х жыў у Ленінградзе, а пасля ў Парыжы.

Асабліва яркія ўражанні ў студэнтаў засталіся ад паездак на Рэюньён – французскі востраў у Індыйскім акіяне за 700 кіламетраў ад Мадагаскара.

– Мы былі там амаль месяц, і кожную раніцу Міхаіл Антонавіч пачынаў з фіззарадкі, – успамінае Марыя. – Ён быў у выдатнай фізічнай форме: падцягнуты, станісты. Усе нашы трапезы адбываліся на свежым паветры і расцягваліся мінімум на паўтары гадзіны. Ежу падавалі парцыённа, але можна было прасіць дабаўку. Мы гэтым карысталіся, ён ніколі. Аднойчы мы запыталіся: «Чаму?» І атрымалі адказ: «Ведаеце, сябры, калі б я еў столькі, колькі хачу, дык не сядзеў бы тут побач з вамі».

Ці ён хварэў ужо тады, на пачатку 2000-х? Калі так, дык вельмі спрытна гэта хаваў.

Пасля 2005-га на яго абрынуўся шэраг удараў. Аднак ён не даў сябе зламаць. Зацята працаваў у Нацыянальным народным аркестры, дзе ў яго з'явіліся моцныя, працавітыя і добра адукаваныя паплечнікі: бязмежна аддany яму дырэктар Аляксандр Ліўшыц, дырыжоры Аляксандр Высоцкі і заслужаны артыст Беларусі Аляксандр Крамко, лектар-музыказнаўца Вольга Брылон. Разам з падтрымкай дзяржавы гэта была магутная сіла, якая штурхала яго наперад, да новых музычных гарызонтаў.

– Калі праз яго рукі стаў праходзіць вялікі сімфанічны рэпертуар, ён зусім іначай пачаў ставіцца да народнага аркестра, – лічыць Аляксандр Высоцкі. – Магутныя кульмінацыі, моцная фактура… Ён часта мяняў нават форму твора. Валодаючы каласальнай музычнай інтуіцыяй, выкідваў цэлыя эпізоды, часам нешта дадаваў, мяняў тэмбры. І больш да гэтага не вяртаўся.

Як яго «рэдактуры» ўспрымалі кампазітары? Здаралася, са злосцю, а найчасцей з удзячнасцю і даверам.

Аднак каб збіраць аншлагі, трэба было мяняць і сам падыход да стварэння музычных праграм.

– Крамко зрабіў выдатны пераклад п'ес Поля Марыа на ансамбль цымбал, – расказвае Ліўшыц. – З імі

**Міхаіл Казінец з вучнямі Вілейскай дзіцячай школы мастацтваў. Пачатак 2000-х гадоў**



нашы артысты выступалі ў падземным гандлёвым цэнтры «Сталіца». Прапаную Казінцу: «Мо пойдзем паслухаем?» Павагаўся, але пагадзіўся. Спусціліся, паслухалі. «Ну, як?» А ён не можа ні пахваліць, ні палаяць: надта ж прыгожае клавесіннае гучанне. Падумаў і кажа: «Падземная музыка!»

***«Гэта не толькі выдатны музыкант, а і надзвычай прыстойны, сумленны чалавек, які за 50 гадоў нікога не падставіў, не зняважыў, не зрабіў крыўды нікому».***

Але менавіта адсюль вытокі таго працэсу, які прывёў, з аднаго боку, да мулявінскага «Гусляра» і «Песні пра долю», з другога боку – да канцэртаў Вівальдзі.

Якім ён быў кіраўніком? А чалавекам? І хіба гэта не адно і тое ж?

Найперш інтэлігентам да мозгу касцей.

– Яго юбілеі заўжды адзначалі ў Вілейцы, – успамінае Барыс Ліўшыц. – Ехалі туды ў поўным складзе, пасля канцэрта быў банкет. Адна артыстка падыходзіць да Міхаіла Антонавіча і кажа: «Не хачу быць на вашым юбілеі, бо вы для мяне ніхто». Іншы кіраўнік адразу б звольніў, а Казінец нават не раззлаваўся: «Ваша права».

– Нам у філармоніі па-добраму зайздросцілі, што мы працавалі пад кіраўніцтвам Казінца, – расказвае Вольга Брылон. – Гэта не толькі выдатны музыкант, а і надзвычай прыстойны, сумленны чалавек, які за 50 гадоў нікога не падставіў, не зняважыў, не зрабіў крыўды, заўжды казаў праўду ў вочы. Дзякуючы яму ў нас ніколі не было звадак, чым часта грашаць творчыя калектывы. Ён быў для нас бясспрэчны аўтарытэт, мы больш за ўсё баяліся яго ў нечым падвесці.

Пахавалі Міхаіла Казінца, як ён завяшчаў, на вілейскіх гарадскіх могілках каля брата Мікалая.



**Міхаіл Казінец цешыўся з адкрыцця Алеі славы каля філармоніі, дзе з'явілася елачка імя Іосіфа Жыновіча. Кастрычнік 2016 года**

Хаця мог бы ляжаць у пачэсным месцы побач з кампазітарамі, чыю музыку выконваў: з Глебавым, Смольскім, Мулявіным.

– Прыйшлі аркестранты наведаць яго магілу і кажуць: «Вось мы, Міхаіл Антонавіч, твае авечкі», – не хавала слёз падчас нашай сустрэчы ў Вілейцы дырэктар мясцовай музычнай школы Наталля Сліжова.

Пытаюся ў Вольгі Брылон, ці называў ён іх авечкамі:

– Не, ніколі.

І яны не называлі яго пастырам, але дакладна гэта адчуваюць. Як і тое, што замены яму няма. Дух яго ў небе, а цела ў роднай вілейскай зямлі, што ўзрасціла яго ў песнях і танцах.

***Юлія АНДРЭЕВА***
***Фота Алены ЦІМАФЕЕНКА, БЕЛТА, з прыватных архіваў і адкрытых крыніц***